У сваю пару было зафіксавана: пад уплывам першага рамана У.Эка ў Еўропе павялічылася колькасць студэнтаў, якія запісваліся на аддзяленне сярэднявечнай гісторыі. Кнігі У.Эка стваралі сваім выхадам у свет грамадскую падзею. Такой падзеяй стала і ўся творчасць У.Караткевіча, што абуджае пачуццё нацыянальнай самасвядомасці ў новых і новых пакаленняў беларусаў. Гэтае пачуццё, зразумела, не прыходзіць да ўсіх адначасова. Затое, калі спазнаеш яго аднойчы, то пачынаеш любіць не абстрактную радзіму, а спрадвечную Беларусь з усім багаццем гісторыі.

Было б наіўна і нават не зусім карэктна ў адносінах да пісьменніка У.Караткевіча сцвярджаць сёння, што ў 1960-я гг., падчас росквіту сацыялістычнага рэалізму, ён быў тэарэтыкам постмадэрнізму, дасведчаным семіётыкам узроўню У.Эка, будаваў творы ў адпаведнасці з прынцыпамі, акрэсленымі Дэлёзам, Фуко або Ліатарам. Вядома, гэта не так. Пакінуў след у беларускай літаратуры вельмі таленавіты чалавек, здольны ўспрымаць імпульсы развіцця сусветнага літаратурнага працэсу. Неадназначна ўспрымаюцца яго творы і сёння. Таму і даследаванне яго творчай манеры вымагае ад нас пошуку розных, магчыма, і нечаканых падыходаў. Мы павінны адэкватна ўяўляць годнае развіццё беларускай літаратуры ў агульнаеўрапейскім кантэксце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Палуянава А.М.,**
*суіскальнік кафедры беларускай*
*і сусветнай мастацкай культуры*

## ФАНТАСТЫКА Ў АПАВЯДАННІ Б.САЧАНКІ "КАРЧОЎНІК"

Існуе некалькі галін, у якіх пісьменнікі-фантасты чэрпаюць ідэі і сюжэты для сваіх твораў. Адна з іх — гэта

кантакты з некім ці нечым незвычайным, што немагчыма растлумачыць, а часам і асэнсаваць: чараўніцтвам, экстрасенсорыкай, парапсіхалогіяй. Нават у звычайных жыццёвых абставінах, калі прыгледзецца да іх больш уважліва, магчыма ўбачыць нейкую загадкавасць, але адначасова і нейкую сістэму. Напрыклад, дзіўнае чаргаванне поспехаў і няўдач у жыцці чалавека, чорных і светлых дзён. Зараз усё гэта спрабуюць растлумачыць біярытмамі, уздзеяннем космасу, рознымі геафізічнымі і метэаралагічнымі фактарамі, імкнуцца адшукаць у гэтым нейкую агульную сістэму, выводзяць агульныя формулы, будуюць графікі і дыяграмы.

Барыс Сачанка ў сваім апавяданні "Карчоўнік" (надрукаваным у зборніку "Выкраданне чарадзея". Мн., 1993) звяртаецца да аднаго з самых эфектных аспектаў чалавечай жыццядзейнасці — незвычайнай удачлівасці героя. Ён дае гэтаму ўласнае, вельмі простае тлумачэнне: герою шанцуе ў жыцці таму, што ён аддаў душу д'яблу. Дакладней, не самому д'яблу, а Карчоўніку, чорціку, які жыве ў карчах на балоце. Але і яго магчымасцей дастаткова, каб задаволіць усе жаданні героя. Поспех суправаджае героя на працягу ўсяго жыцця, але ў рэшце рэшт наступае расплата.

Тэма продажу душы нячыстай сіле даволі распаўсюджана ў літаратуры, і развіццё сюжэта заўсёды ідзе аднолькава: герой заключае пагадненне з д'яблам і ў абмен на душу атрымлівае нейкія багацці, а праз некаторы час д'ябал патрабуе ад чалавека выканання дамовы.

Менавіта такая сюжэтная лінія і ў апавяданні Сачанкі: каб захаваць жыццё, хлопчык пагаджаецца прадаць душу нячысціку.

Але ёсць нешта, што не дазваляе цалкам пагадзіцца з аўтарам. Гэта — выбар героя, дакладней — узросту, у якім герой вымушаны пайсці на дагавор з нячыстай сілай.

Заключэнне пагаднення з д'яблам, наогул з нячыстай сілай,— заўжды вынік нейкіх разважанняў, маральны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выбар, які робіць чалавек, зыходзячы з уласнага жыццёвага вопыту. Прыгадаем Фаўста, які кажа:

Я философию постиг,
Я стал юристом, стал врачом...
Увы! С усердьем и трудом
И в богословье я проник,—
И не умней я стал, в конце концов,
Чем прежде был...

(Гётэ. Фаўст.)

Гэты сталы чалавек рэальна ацэньвае сябе, свае магчымасці, жаданні:

Я слишком стар, чтоб тешиться игрою,
И слишком юн, чтоб без желаний быть...

Таму і свой выбар ён робіць свядома.

У апавяданні ж Сачанкі маленькі Петрык, хаваючыся на балоце ад немцаў, сустракае Карчоўніка, які прапануе яму прадаць душу ў абмен на выратаванне жыцця. З дзядулевых казак хлопчык ведае, што гэта такое (апавяданне, уласна кажучы, і пачынаецца словамі: “Напачатку была казка...”). Але веды гэтыя наўрад ці дапамогуць зрабіць правільны выбар у дадзеных абставінах; герой нават не ўяўляе, што ён робіць нейкі выбар. Ягоныя ўчынкі — дзеянні перапужанага дзіцяці.

Карчоўнік прапануе хлопчыку прадаць душу: “Жыць застанешся... Я праганю немца, не заб'е ён цябе... Маці знойдзеш. Вернешся дадому, у вёску. Канца вайны дачакаешся... У школу пойдзеш... Станеш вядомым чалавекам. Будзеш жыць так, што зайздросціць табе будуць...” Калі ж герой не згодзіцца, дык у яго ёсць “альтэрнатыва”: “А то... Крыкну — і бясплатна душу тваю забяру. Чарга з аўтамата — і ты... Мёртвы...” У гэтых абставінах не дзіва, што Петрык (“не ўсведамляючы, што робіць — а можа, ад страху, немец жа зусім блізка стаяў!..”) прымае прапанову. Але і гэта адбываецца толькі сімвалічна: ён пацiскае нячысціку руку. Пры тым, што традыцыйна заключэнне такога пагаднення патрабуе выканання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пэўных рытуальных дзеянняў: ад пацвярджэн-ня згоды чалавека на словах да падпісання дамовы ўласнаю крывёй.

Што датычыцца выбару ўзросту героя, то, з аднаго боку, ён пярэчыць існуючай традыцыі: ніколі ні ў фальклоры, ні ў літаратуры д'ябал не звяртаецца да дзіцяці (і наогул да чалавека, не здольнага адказваць за свае ўчынкі) з прапановай прадаць душу. З другога ж боку, такі ўзрост героя не дазваляе аўтару ў поўнай меры раскрыць праблему маральнага выбару. Гэта ён выдатна робіць, дарэчы, у іншым сваім апавяданні —"Чортава прапанова".

Але, нягледзячы на некаторую, на наш погляд, памылковую пасылку ў пачатку апавядання, будуецца яно далей вельмі лагічна.

Усё, што абяцаў нячысцік герою, спраўдзілася. Хлопчык застаўся жывы, вярнуўся дадому, да маці; немцы пакінулі вёску, знайшоўся бацька; пасля вайны сям'я пераехала ў горад, Петрык пайшоў у школу. Жыццё хлопчыка "пайшло лёгка, без якіх бы там ні было непрыемнасцей і ўскладненняў". Вучыўся ён выдатна, "усюды і ва ўсім ён паспяваў, паказваў спрыт, дамагаўся поспехаў". Паступіў ва універсітэт, яшчэ студэнтам стаў вядомы, нават за мяжой, як выдатны навуковец, разам з дыпломам атрымаў пасведчанне кандыдата навук, праз два гады стаў доктарам, а хутка і членам-карэспандэнтам, акадэмікам. Не толькі кар'ера Пятра складвалася без праблем. Як мага лепей ішло і яго сямейнае жыццё: жонка, дачка, зяць, унук — усе яны прыносілі толькі радасць.

Такім чынам, герой атрымаў усё, аб чым толькі можа марыць звычайны чалавек. Пётр Пятровіч шчаслівы, задаволены жыццём. Пра сваю дамову з Карчоўнікам ён амаль і не ўспамінае, лічыць нячысціка выдумкай, дзедавай фантазіяй. Таму, можа, і не выяўляецца ў ім злое ні знешне, ні ўнутрана, як, напрыклад, у героя апавядання Бальзака "Дараваны Мельмот" Кастаньё. Прадаўшы душу д'яблу, ён змяняецца і духоўна, і фізічна. Яго

ўнутраны склад, яго чалавечая сутнасць разбураюцца, і ён усведамляе гэта. Можна нагадаць таксама герояў раманаў А.Уайльда "Партрэт Дарыяна Грэя", Т.Мана "Доктар Фаўстус" і многіх іншых: усе яны пасля сустрэчы з нячыстай сілай змяняюцца. Герой жа Сачанкі нічым на іх не падобны. Знешне ён рухавы, маладжавы, жыццярадасны чалавек. І жыве ён у згодзе з самім сабою і светам. Можа, гэта таму, што ён не ўсведамляе свайго кантакту са злом і не адчувае прысутнасці яго побач з сабой або ўнутры сябе, як, напрыклад, Іван Карамазаў Ф.Дастаеўскага або Адрыян Леверкюн Т.Мана. Пётр Пятровіч у апавяданні Сачанкі не творыць зла, не бачыць яго ні ў сабе, ні ў іншых. Ён імкнецца да простых жыццёвых радасцей. Але атрымлівае іх лёгка, практычна без намаганняў, не разумеючы, чаму іншыя людзі не такія ўдачлівыя. І гэта не душэўная чэрствасць. Проста, прывыкшы да добрага, герой ужо не ўяўляе, як можна чаго-небудзь хацець і гэтага не мець.

Але ў той момант, калі жыццё Пятра Пятровіча ідзе лёгка і шчасліва, нячысцік нагадвае пра сябе і патрабуе выканання дамовы. І зноў-такі, прыходзіць ён не да сталага чалавека, якім стаў герой, а да маленькага хлопчыка — яго ўнука. Карчоўнік патрабуе душу, якая яму належыць, і ўсялякая барацьба з ім дарэмная. Не здолеўшы супрацьстаяць нячыстай сіле, герой памірае. А пасля яго смерці пачынаецца адплата: усё, што тварыў герой, руйнуецца: памірае жонка, гараць дача і машына, у аўтакатастрофе гінуць дачка, зяць і ўнук. І вось "хутка ад сям'і, якой зайздросцілі, засталіся толькі ўспаміны". Такі фінал апавядання.

На гэтым можна было б паставіць кропку, узяўшы за асноўную ідэю апавядання продаж душы д'яблу, далейшае пакаранне. Але падобны фінал хутчэй паказвае перамогу нейкіх злых сіл над чалавекам. Застаюцца і пэўныя пытанні, на якія складана адказаць у межах дадзенай сюжэтнай лініі: чаму праблема выбару ставіцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перад маленькім хлопчыкам? Чаму пакаранне спасцігае, па сутнасці, не героя, а яго сям'ю? Увогуле складваецца ўражанне, што ў героя апавядання ёсць рэальны прататып — чалавек або сям'я з падобным лёсам. Таму здаецца магчымым зноў вярнуцца да ідэі чорных і светлых палос у жыцці чалавека. Неверагодная ўдачлівасць героя Сачанкі — гэта вялікая светлая паласа ў яго жыцці. Але немагчыма, каб усё жыццё чалавека было адной светлай паласой, немагчыма толькі браць у Лёсу і нічога не ахвяраваць таму ўзамен. Менавіта пра гэта казаў Шылер у сваёй баладзе:

Судьба и в милостях мздоимец:
Какой, какой ее любимец
Свой век не бедственно кончал?

(Шиллер. Перстень Поликрата.)

З такога пункту гледжання фінал апавядання становіцца заканамерным. І калі ўспрыняць апавяданне Сачанкі як спробу растлумачыць гэтую з'яву, можна зрабіць яшчэ адну выснову. Светлая паласа ў жыцці заўжды замяняецца на цёмную, і чым шырэйшай была светлая, чым больш атрымлівае чалавек ад жыцця, амаль не трацячы на гэта сіл, тым страшнейшай аказваецца чорная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Лычагіна Т.А.,**
*суіскальнік кафедры*
*бібліяграфіі і дакументазнаўства*

## ХВАЛІ "ЭРЫДАНА"

Да апошняга часу кнігавыданне ў Беларусі лічылася адным з лепшых у ранейшым Савецкім Саюзе. Так было і ў 1990 г., калі ўвесь адукаваны свет адзначаў 500-годдзе з дня нараджэння Ф.Скарыны, і ў 1992 г., калі Асацыяцыяй кнігавыдаўцоў быў арганізаваны конкурс "Лепшыя кнігі". Адным з лаўрэатаў названага конкурсу стала выдавецтва